ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 7 (389) Пятніца, 14 студзеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню: у чацьвер, пятніцу і нядзелю. | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 905 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвонай Зьмены. Менск, Комсам. 25.

Менская Акруговая Конфэрэнцыя ЛКСМБ.

5-га лютага склікаецца чарговая МЕНСКАЯ АКРУГОВАЯ КОНФЭРЭНЦЫЯ ЛКСМБ.

Падрабязговая абвестка дню будзе зьмяшчана у чарговым нумару.

Сакратар Менск. Акруркому П. ШАЛІМА.

Х-ты зьезд КП(б)Б аб комсамоле.

(Вытрымка з прамовы тав. Крыніцкага «Палітычная справаздача ЦК КП(б)Б»)

... Пытаньні аб комсамоле набываюць вялікае палітычнае значэньне, асабліва ў нашых умовах. Мы зараз маем больш 60 000 комсамольцаў у Беларусі, лічачы Гомельскую і Рэчыцкую організацыі. Мы маем 80-90 тысяч піонэраў. Комсамол—асноўны рэзерв КПБ. Комсамол—важнейшая грамадзкая організацыя, якая працуе пад кіраўніцтвам партыі. У гэтым сэнсе роля комсамолу расьце, будзе расьці і далей.

У колькасным росьце комсамолу адзначаецца павялічэньне проценту непролетарскіх, галоўным чынам сялянскіх элемэнтаў. Трэба яшчэ адзначыць, што мы ня можам выстаўляючы палянаскy ..хоўваць комсамол і тым наближаць яго да сапраўднай працы па комуністычнаму. Партыйнае ядро комсамолу вырасла ад 6,9 да 7,2 проц. Аднак, таксама партыйнае ядро зразумела невялікае, каб весьці ўнутры комсамолу вялікую выхаваўчую працу ў організацыі, што ўцягвае ў свае шэрагі рабочую, але галоўным чынам сялянскую моладзь, у той організацыі, якая заўтра дасьць новых партыйцаў, павінных праводзіць пролетарскую лінію ва ўсім будаўніцтве ў горадзе і ў вёсцы.

Такім чынам перад намі стаіць неабходнасьць уважлівага вучоту магчымых палітычных небясьпек у працы і развіцьці комсамолу, неабходнасьць далейшага паглыбленьня комсамолу, як ленінскай організацыі шляхам дапамогі яму з боку партыі ў справе далейшай вучобы комсамолу над кнігай, у справе далейшага ўцягваньня комсамолу ва ўсё практычнае будаўніцтва.

Усе ўмовы патрабуюць больш уважлівых адносін усяе партыі з нізу да верху да комсамолу, уласна з пункту гледжаньня забесьпячэньня пролетарскай лініі партыі і ўсяго будаўніцтва.

Што казалі комсамольцы на Х партзьезьдзе?

Прамова т. Пыкснова.

Сярод моладзі, і часткова сярод комсамольцаў бачыш шэраг жахлівых зьявішч п'янства, хуліганства. Усё гэта магчыма зьнішчыць толькі шляхам культурна-масавай працы. Комсамол свайх клюбаў ня мае, затым гэтую работу можна праводзіць [illegible] юнацкіх сэкцыях пры агульных профсаюзных клюбах. Акрамя таго што гэтыя клюбы знаходзяцца ў цяжкім становішчы, профсаюзы не заўсёды зварочваюць належную ўвагу у працы юнацкіх сэкцый і не аказваюць ім належнага патрыманьня.

Наступнае пытаньне—гэта аб фізкультуры, якое таксама павінна заняць вялікае месца ў нашай працы і якое не атрымоўвае належнага патрыманьня з боку савецкіх і профсаюзных організацый.

Комсамол за апошні год на падставе праводзеньня ў жыцьцё пастановы 9 га зьезду КП(б)Б і 14 з'езду партыі, мае шэраг дасягненьняў у сваёй працы, але разам з тым ёсьць яшчэ і недахопы. Патрабуецца далейшае ажыўленьне працы саюзу. Галоўнейшым шляхам гэтага ажыўленьня, павінна зьявіцца ўцягваньне моладзі ў грамадзкую і гаспадарчую работу. Комсамол з свайго боку робіць усё неабходнае. Неабходна, каб партыйцы, кіраўнікі савецкіх профсаюзных, гаспадарчых і грамадзкіх організацый дапамагалі ўцягнуць моладзь у гэтую практычную работу.

Як комсамол праводзіць нацыянальную палітыку ў сваіх організацыях.

Я дазволю падкрэсьліць што комсамол праводзіць цьвёрда і рашуча палітыку партыі ў нацыянальным пытаньні. Дасягненьні маюцца значныя: высоўваньне карэннога актыву, абслугоўваньне моладзі розных нацыянальнасьцяў на іх роднай мове, умацаваньне кіраўніцтва літаратурнай організацыі «Маладняк» і г. д. Але разам з тым ёсьць яшчэ вялікія недахопы. Некаторая частка організацый і часткова рабоча-гарадзкая моладзь мае вельскія адносіны да беларускай мовы, не ўявіла яшчэ як сьлед нацыянальную палітыку партыі. У гэтай частцы партыі і комсамолу разам неабходна завострыць увагу, растлумачыць рабочай моладзі пытаньні нацыянальнай палітыкі і задачы рабочай моладзі ў гэтай галіне.


Таварышы, да таго, што сказаў тав. Барвенікаў «Аб экономічным становішчы рабочай моладзі», трэба дадаць, што многія часткі пастановы 9 га зьезду партыі, па пытаньню аб комсамоле, не выконваюцца з боку гаспадарчых органаў.

Няма належнай зацікаўленасьці гаспадарчых органаў пытаньнем кваліфікацыі моладзі. Дырэктывы 9 га зьезду аб запазненьні броні, аб рэорганізаваньні перадрасткаў яшчэ не выкананы і ўсе стараньні комсамолу ня скончыліся вялікім посьпехам, дзякуючы таму, што савецкі гаспадарнікі не ўдзяляюць гэтаму пытаньню належнай увагі, а ўскладаюць усё на комсамол.

Маюцца ненормальнасьці і ў галіне зарплаты моладзі, асабліва ў працоўных колектывах, дзе моладзь да 18 гадоў не аплачваецца за 2 гадзіны. Моладзь кажуць, працуйце поўны працоўны дзень, а іншы за 2 гадзіны не заплацім. Гэта зьяўляецца парушэньнем закону аб аплаце працы рабочай моладзі.

Таварышы, я хачу сказаць некалькі слоў «Аб кватэрнай кооперацыі. У нас часткова на фактах «Дзьвіна» падымаецца пытаньне «О тым, каб для моладзі даволіць колектыўнае сяброўства, бо зарплата моладзі малая і яна ня мае магчымасьці ўнясьці пай. Дзеля таго, каб моладзь магла ўдзельнічаць у кватэрным будаўнічай кооперацыі, неабходна разьвіваць для яе колектыўнае сяброўства.

Мне хацелася яшчэ спыніцца на жыцьці піонэр організацыі. Калі ў галіне комсамолу метады работы, формы яе і асноўныя шляхі ясны, дык у галіне працы піонэр організацыі маюцца вялікія цяжкасьці і неясласьці. Неабходна парторганізацыям прыняць усе меры да таго, каб палепшыць зьмест працы, унясьці яснасьці ў мэтады і формы яе. Неабходна забясьпечыць піонэрорганізацыі (аб чым гаварыў 9 ты зьезд партыі) дзіцячаю літаратураю на беларускай мове. А гэтага ў нас, да гэтага часу, няма. І нарэшце, неабходна забясьпечыць піонэрорганізацыю адпаведнымі кіраўнікамі партыйцамі. Комсамольцаў партыйцаў высоўваюць на грамадзкую, савецкую і інш. працу, а на піонэр працу высоўваюць вельмі мала і ад гэтага кульгае праца.



Прывітаньне

Комсамольскі атрад Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў ліку 330 чалавек у дзень 5-й гадавіны свайго існаваньня шле гарачае комсамольскае прывітаньне, „Чырвонай Зьмене“—воргану ЦК і МК ЛКСМБ.

Друк увесь час зьяўляўся і зьяўляецца барацьбітом у галіне ідэолёгічнага аформленьня чалавека „Чырвонай Зьмены“ таксама зьяўляецца барацьбітом у справе ідэолёгічнага выхаваньня дзесяткаў тысяч рабоча-сялянскай моладзі няхай жа комсамольскі друк разьбіе кавалкі старога быту.

Няхай шырыцца ўплыў «Чырвонай Зьмены» ва ўсіх кутох жыцьця моладзі!

Прэзыдыум сходу.

Фашысты Літвы рыхтуюцца да новых расстрэлаў

Абаронім прадстаўнікоў літоўскае рабочае клясы.

(З адозвы ЦК МОПР'у).

Выканком МОПР'у зьвярнуўся да ўсіх працоўных з адозваю у якой гаворыцца:

„Сьледам за забойствам чатырох фашысты намячаюць новыя 30 ахвяр. Згодна атрыманых вестак, пастаноўлена: аддаць вайскова-палявому суду: у Коўні—8 ч., у Шаўлях—8 ч., у Панявежы—8 ч. і ў Мэмелі—6 ч. Гэтыя 30 ахвяр заклікаюць увесь цівілізаваны сьвет абараніць і дапамагчы ім. Абавязак пролетарскае солідарнасьці заклікае ўсіх працоўных, пачуцьцё проста чалавечнасьці заклікае ўсіх сумленных людзей з найбольшай хуткасьцю і энэргіяй узьняць свой голас дзеля адратаваньня 30 намечаных ахвяр“.

Новыя арышты ў Коўні.

Па загаду новага начальніка Ковенскае палітычнае паліцыі, арыштаваны 6 сяброў Ковенскае мястовыя рады, па абвінавачваньню ў «комуністычнай дзейнасьці».

Абвінавачаньне грунтуецца толькі на тым, што гэтыя сябры мястовае рады протэставалі, у свой час проці расстрэлу чатырох комуністаў.

Панам усё, а сялянам—ліха.

Віленскі сельска-гаспадарчы банк на працягу часу з 1923 г. по 1925 г. зрабіў цывільным асаднікам 680 пазык на 360.000 злотых. Такім чынам на кожнага асадніка прыпадае па 620 злотых. У 1926 г. 836 асаднікам пазычана 297.860 злотых. Апроч гэтага вайсковым асаднікам выдана за першы пэрыод 912 пазык на 470.774 злотых, а ў 1926 г.—213 пазык на 218.050 злотых, альбо больш як па тысячы злотых на кожнага асадніка.

Беларускія сяляне, гаспадаркі якіх руйнуюцца з прычыны недахопу сельска-гаспадарчых машын, за ўвесь час не атрымалі ў банку ніводнай капейкі.

Перамога рабочых.

Забастоўка рабочых віленскага газавага заводу, якая цягнулася цэлы тыдзень, скончана. Прадпрыемцы згадзіліся заплаціць за час забастоўкі, а таксама 10-ті процантную надбаўку за зімовыя месяцы (лістапад—сакавік), але адмовіліся заключыць калектыўны дагавор з рабочымі.

Масавае беспрацоўе.

Лік беспрацоўных на крэсах павялічваецца з кожным тыднем. Віленская біржа працы не пасьпявае рэгістраваць беспрацоўных, якія прыбываюць туды з усіх канцоў Заходняй Беларусі. У Вільны толькі 30 процантаў беспрацоўных атрымліваюць дапамогу, а рэштка беспрацоўных галадае і пачынае жабраваць.

Кітай перамагае засільле імпэрыялістаў

Не дапаможа ніякая інтэрвэнцыя

Прызнаньне імпэрыялістаў у сваім бясьсільлі

Водлуг паведамленьняў з Шанхаю, ангельскія колы ў Шанхаі пераконаны, што кантонцы хочуць гвалтоўна зьнішчыць прывілеі чужаземцаў, і што падзеі зайшлі так далёка, што ваенная інтэрвэнцыя ўжо нічым не дапаможа. Злучаныя Штаты ня будуць перашкаджаць заняцьцю Шанхаю кантонцамі“.

Бясьсільле і злосьць ангельскае рэакцыі

Рэакцыйная ангельская газэта „Пекін Цянь Цьзін Таймс“ наконт падзей у Ханькоў піша: „Вынік падзей у Ханькоу вырашыць лёс ангельскіх інтарэсаў у Кітаі. Ангельская концэсія у Ханькоу павінна быць вернута па прыналежнасьці. Мы ўпэўнены, што ангельская ўлада ўжыве сілу для абароны нашых інтарэсаў. Граніца нашага цярпеньня перапоўнена“

Кітайская паліцыя на тэрыторыі концэсіі

Чужаземны друк з Ханькоу паведамляе, што паліцыя ангельскае концэсіі ізноў распачала выконваць свае абавязкі, але кітайская паліцыя застаецца далей на концэсіі, прычым кітайская паліцыя ўзброена, а паліцыя концэсіі—не.

Амаль што ўсе установы і прадпрыемствы на тэрыторыі ангельскае концэсіі аднавілі 8-га студзеня дзейнасьць.

Кантонская камісія па кіраваньню концэсыяй

Рэйтэр паведамляе, што Чэн (міністр замежных спраў кантонскага ўраду), Сінь-Фо (сын Сун-Ят-Сена, (міністр шляхоў) і Сун-Цзе-Вэн (міністр фінансаў) распачалі выконваць абавязкі ў якасьці сяброў рады, складзенай у зьвязку з апошнімі падзеямі, для кіраваньня ангельскай концесіяй.

У панскай Польшчы.

Заява Залескага аб замежнай палітыцы Польшчы.

Міністр замежных спраў Залескі сказаў у клюбе вывучэньня міжнародных адносін вялікую прамову аб замежнай палітыцы Польшчы. Ён зазначыў:

„За апошні час у Нямеччыне праводзіцца суровая кампанія за перагляд нашых заходніх граніц. Мы жадаем добрых дачыненьняў з Нямеччынаю, але ня ўступім ніводнае пядзі паморскае і сілескае зямлі.

Наша палітыка ў дачыненьні да СССР заснована на імкненьні польскага народу падтрымліваць з Савецкім Саюзам мірныя і прыяцельскія адносіны. Не зважаючы на ўсе цяжкасьці, польская палітыка на Ўсходзе будзе кіравацца прынцыпамі міру і ўзятых на сябе абавязкаў.

У Заходняй Беларусі.

Савецкі хлеб у Вільні.

ВІЛЬНЯ. На мясцовым рынку паявіўся савецкі хлеб. Якасьць яго значна лепшая, чым польскага. Акрамя таго савецкі хлеб дзешавей.

Беспрацоўе павялічваецца, дарагоўля расьце.

На конфэрэнцыі вярхоўнае рады хрысьціянска-дэмократычнае партыі Польшчы Карфанты, які выступіў з дакладам аб экономічным становішчы Польшчы заявіў: «За апошнія тыдні беспрацоўе ў краі павялічваецца, дарагоўля расьце. Калі выявіцца, што Польшча прымушана вывозіць хлеб, дык становішча стане катастрофічным“.

Калі прыдуць ледаколы.

У Кронштацкай гавані ціха. Бязьлюдны засьнежаны Пятроўскі парк, спакойна дрэмле сьвінцовы кругавід, жывое сіняе мора загарнулася ў цяжкое убраньне ільду.

Прышвартаваныя да молу стаяць побач закаханыя марскія гіганты „МАРАТ“ і „ПАРЫСКАЯ КОМУНА“. Яны маўклівы і пануры. На верхніх палубах ня снуюць матросы, на мачтах не выгінаюцца спрытныя, гнуткія фігуры. Праца ідзе ўнутры караблёў, у вузкіх праходах машынных аддзяленьняў. Там соткі чумазых дактароў крапатліва і ўпарта лечаць пашкоджаныя турбіны. Там звон жалеза, вугаль, мазут, кароткія размовы і загады. Зімовыя, рамонтныя працы ў распале...

Гіганты маўклівы і пануры. Яны прыслухоўваюцца да вязьні людзей у іх жалезных унутранасьцях, да суровай песьні ветру, прыляцеўшага з берагоў Норвэгіі, і аб чымсьці марацьць... Аб чым? Можа аб далёкай Францыі, якая дала ім такія прыгожыя імёны, ці аб зялёных пустынях Атлянтычнага акіяну, ці аб зьвілістых берагох Скандынавіі? Не, не аб гэтым мараць лінкоры. Яны—аб іншым.

...Па вечарох калі канчаюцца рамонтныя працы, чырвонафлётцы абодвых лінкораў ідуць у госьці адзін да другога. Матрасьня спушчаецца па ярка-асьветленым трапам і рушыцца па вузкаму молу... Чорныя істужкі „безказырак“ і моцныя грудастыя крыжы дрыжаць у паветры.

Хлопцы з „ПАРЫСКАЙ КОМУНЫ“ любяць бываць на „МАРАЦЕ“. Там—жыцьцё. Шэф „МАРАТА“ — Маскоўскі Комсамол—паставіў ва ўсіх кубрыках „чырвоныя сталы“. На гэтых сталох — цікавыя кніжкі, часопісі, справачнікі, балалайкі, мандаліны, гармошкі, радыё-прыёмнікі, шашкі, шахматы... Раздолье! Любата! Ёсьць дзе „отвести душу“. І бывае, што „паркомунцы“ засіджваюцца ў „маратаўцаў“ да позьняга часу.

Ня тое ў кубрыках „ПАРЫСКАЙ КОМУНЫ“. Іх шэф-Комсамол Беларусі—не паклапаціўся ні аб сталох, ні аб адпаведнай літаратуры, ні аб гармошцы. Сумнавата ў кубрыках. Хлопцы большай часткай ляжаць на рундуках*) і ў тысячны раз апавядаюць аб сваіх любоўных прыгодах. Не дарма кажуць чырвонафлётцы: „итак всю жизнь на рундуке“...

Іншы раз прыдзе з Беларусі партыя літаратуры і два-тры лісты ад комсамольцаў. Зьбяруцца тады чырвонафлётцы ў кубрыку і чытаюць ліст. Але рэдка яны знаходзяць у ім цікавае. Звычайна ўсе лісты комсамольскія бываюць такога зьместу: „у нас у ячэйцы 18 сяброў. Пасяджэньняў бюро было праведзена 5, агульных сходаў—6, партыйнае кіраўніцтва ўзмацняецца і г. д. і г. д. А ў Аршаншчыне знайшоўся адзін чудак, мякка кажучы, які напісаў наступнае: „На маю няшчасную долю выпала сувязь з флётам. Але я ня ведаю што рабіць?“.

Зразумела, чаму пасьля гэтага чырвонафлётцы кажуць:

— Зусім ня відаць, што ў нас шэф... Таму і жыцьцё так вяла праходзіць...

* * *

Яшчэ два-тры месяцы і сьвінцовы кругавід пасьвятлее. Здалёка, з бязьмежных прастораў прыдуць магутныя ледаколы, якія водзяць цяпер па марам караваны савецкіх судоў. Ледаколы прарэжуць ледзяное ўбраньне, вызваляць жывыя, блакітныя хвалі. У гавані заб'е жыцьцё. Пачнуць хадзіць буксіры, катэры, зьявяцца шлюпкі, паваліць дым, успыхнуць агенькі ілюмінатараў! Матросы ў кароценькіх бушлатах засыпяць верхнія палубы. І ўсе гэта будзе называцца адным маленькім словам: вясна.

Ці прыдзе вясна ў нашу шэфскую працу? Ці ўзарвуць ледаколы комсамольскай самадзейнасьці лёд казённых узаемаадносін? Ці навучымся мы, як належыць, выконваць свае шэфскія абавязкі? Ці будзе на „Парыскай Комуне“ таксама весела і цікава, як на «Мараце»?

...Аб чым марацьць закаханыя „Марат“ і „Парыская Комуна“? На гэта можна даць цяпер адказ. Калі першы з ласкавай ухмылкай успамінае Маскоўскую Комсамолію, дык другая сярдзіта косіцца ў бок Беларусі. Але мы зможам разьвесяліць засумаваўшую „Парыскую Комуну“. Мы зможам!

Міх. Гольдбэрг.

*) Ляжаць у кубрыках.



Выявіла сапраўднае становішча.

Чацьвертая конфэрэнцыя яўрэйскай працоўнай моладзі г. Менску

Што у нас ёсьць?

Калі ў мінулым годзе па Менскай акрузе мы мелі чатыры яўрэйскія вячэрнія школы, дык ў гэтым годзе мы маем дзевяць, а таксама павялічылася лічба політшкол—кажа прадстаўнік акругкому т. Шэйн.

— Васемнаццаць комсамольскіх ячэек переведзена на родную мову, а таксама ўзрасла актыўнасьць яўрэйскай працоўнай моладзі.

— Кепскавата пастаўлена праца сярод яўрэйскай моладзі ў горадзе, бо яна яшчэ толькі пачынае разгортвацца.

Пры клюбе ім. Леніна з'організована юнсэкцыя, якая працуе на яўрэйскай мове.

Пры клюбе КІМ'у з'організованы яўрэйскі драмгурток, гэтак сама ў клюбе па вячорах праводзіцца чытка яўрэйскай літаратуры.

Кустарная моладзь яшчэ не ўцягнута ў працу профорганізацый, яна яшчэ знаходзіцца пад уплывам гаспадароў.

За апошні год з'організована юнсэкцыя маладых саматужнікаў, якая ахапляе 300 чалавек.

Мы не ўцягнуты ў працу.

— Сярод нас не вядзецца аніякае грамадзкай працы, няма аніякіх гурткоў, моладзь на біржы працы займаецца толькі хуліганствам, бо мы не ўцягнуты ў якую небудзь працу—скардзіцца на конфэрэнцыі беспартыйная моладзь.

Няма яўрэйскай моладзі.

— На гэткіх прадпрыемствах, як чыгунка, няма яўрэйскай моладзі; туды ёй вельмі цяжка папасьці, бо там ідзе як бы па спадчыне, калі бацька працуе на чыгунцы, дык і сын мае магчымасьць там працаваць, або вучыцца ў фабзавучы, дзе таксама няма ніводнага яўрэйскага хлапца.

Што перашкаджала працы

На некаторых прадпрыемствах і заводах, як напрыклад скураны завод, зусім няма актыўнасьці. Гэта тлумачыцца тым, што калі бывае сход, дык яўрэйская моладзь няможа выказвацца, а на роднай мове хлапцы саромяцца выступаць.

Аб чым гаварылі профтэхшкольцы.

— У профтэхшколах школьныя заняткі з другога паўгодзьдзя пераходзяць на беларускую мову. Яўрэйскім вучням будзе цяжка вучыцца. Неабходна з'організаваць у профтэхшколах яўрэйскую сэкцыю дзеля таго, каб яўрэйскі хлапец мог вучыцца на роднай мове, і па выпуску змог працаваць сярод яўрэйскай гушчы.

Аб экономпрацы.

Тав. Шнэйдэр у сваёй справаздачы азначыў, што Менскі акругком стараўся ўсімі сіламі палепшыць матар'яльнае становішча працоўнай моладзі.

— Мы маем вялікія дасягненьні: калі ў мінулым годзе першы разрад раўняўся пятнаццаці рублям, дык ў гэтым годзе першы разрад—дзевятнадцаць рублёў. У вялікіх профсаюзах было паслана ў дамы адпачынку 30 проц. моладзі.

Таксама стараліся дзе толькі можна запаўняць бронь.

Перад акругкомам у сучасны момант стаіць пытаньне аб організацыі розных брыгад і працоўных колектываў, а таксама стаіць пытаньне аб організацыі інтэрнату для моладзі, якая атрымоўвае малы разрад і якой цяжка плаціць за памяшканьне.

Што казалі дэлегаты:

Ад электростанцыі.

— Старэйшыя рабочыя кепска адносяцца да вучняў. У той момант, калі той ці другі варштат заняты вучнем, старэйшы майстар зганяе яго і сам займае месца.

— Ну і як здабыць кваліфікацыю?

Ад абуўной фабрыцы.

— На фабрыцы, ў сувязі з разьмяркаваньнем працы хварэе кваліфікацыя вучняў. Напрыклад, вучань ведае толькі адну справу—правіць абсацы ці падбівае падэшвы, а больш нічога і ня ведае.

Ад працколектыву мэталістых.

У нас у працколективе працуе шмат моладзі якой вельмі доўга не павялічалі разрад таму, што кожная капейка каштоўна—кажа адміністрацыя, а вучні не прыносяць ніякае карысьці.

Ад прац колектыву „шчаціна“

Калі вучань мае падход да майстра, і калі вучань яму спадабаецца, дык майстар яму дае добрую працу, і добра вучыць, а калі вучань ня мае гэткага падходу, дык таму вельмі кепска.

Ад фабзавучу гарбароў.

—У фабзавучы вельмі кепска прыстасавана програма, можна вучыцца пяць год і ня здабыць сабе аніякае кваліфікацыі

Ад профшкол.

— Вытворчасьць працы ў профтэхшколах слабая, няма зацікаўленасьці вучняў у вытворчасьці, слабая кваліфікацыя выпусьнікоў.дзяўчаты пабыўшы адзін год у профшколах большай часткай выключаюцца, аб адміністрацыя патрабуе ад дзяўчат гэтакую самую пасьпяховасьць як і ад хлапцоў.

Леў-Кацовіч.



Перавыбары бюро ячэек Магілеўшчыны.

— Дзякуючы добрай падрыхтоўцы, перавыбарная компанія у большасьці льявілася пераломам у працы ячэек; захаваньне прынцыпу комсамольскай дэмократыі—дапамагло разьвіцьцю актыўнасьці комсамольцаў; Бюро ячэек абнавілася на 47 проц.— У складзе сакратароў—38 проц. ізноў вылучаных.

Доўгі час рыхтаваліся

Акругком і Райкомы Магілеўшчыны да перавыбараў бюро ячэек. Яны пачаліся з 20 верасьня, а дырэктывы былі ўжо дадзены з боку Акругкому ў першых лічбах жніўня.

Пашыраныя пленумы Райкомаў у жніўні былі прысьвечаны гэтаму пытаньню.

Акругком і Райкомы прапанавалі:

— Устанаўленьне справаздач бюро, а не сакратароў;

— Падрыхтоўка да гэтага ўсіх сяброў КСМ;

— Разгортваючы дэмократыю, стварыць належны, адказны настрой у комсамольцаў вакол перавыбараў.

І гэтыя дырэктывы, выходзячы з умоў кожнай ячэйкі, былі абгавораны на пасяджэньнях бюро, альбо агульных сходах.

І ў зыніку:

Частка ячэек (Кармянская, Чавусская профшкола і Зарэчча (Чавусы), Сухары, Грэбенева і інш.) падрыхтавалі пісьмовыя справаздачы ўсяго бюро ячэек, зацьвердзілі іх на пасяджэньні;

Скарысталі некаторыя насьценныя газэты (Куралоўшчына, Карма), высьвятляўшы ў іх працу ячэйкі да перавыбараў;

Большая колькасьць прысутнічаўшых на перавыбарчых сходах з усяго ліку ор-цыі прыблізна на 300—адсутнічала ўсяго 6).

Але-ж

ня ўсюды добра.

З 17-ці ячэек Магілеўскага раёну —6 зусім не рыхтаваліся. За 2 гадзіны да агульнага сходу сакратар Сялецкай ячэйкі лётаў шукаць веды аб „працы“ бюро ячэйкі.

Прынцыпова не жадае быць „бюрократам“ сакратар Хацетаўскай ячэйкі Лупалаўскага раёну:—„Чаго рыхтаваць справаздачу, калі хлопцы усё самі ведаюць“.

У Варына-Будзкай ячэйцы сакратар не пажадаў сябе трывожыць і зусім не зьявіўся на сход.

Былі моманты навязваньня кандыдатур у новыя склады бюро ячэек.

Бюро колектыву ф-кі „Спартак“, а потым нарада актыву ф-кі «падрых тоўвалі» для „пасыву“ склады бюро цэхавых ячэек. Ніяк не жадалі Чарнаруцкія комсамольцы абраць Матросава сакратаром ячэйкі, але-ж .. ... Райком „раіць“.

А ў Чачэвічах:

На пасяджэньні бюро Райкому „далікатны“ сакратар «далікатна» размаўляў:—...Неабходна намеціць каго рэкомэндаваць сакратарамі ячэек. Аб сяброх бюро ячэек фіксіраваць ня будзем, а толькі кожны сябр бюро павінен трымаць у думках»...

І ад гэтых „думак“ выводзіцца Чачэвіцкая дэмократыя.

Яны пішуць: «У ячэйках была праведзена шырокая дэмократыя (факт: высунутыя ў Доўгам і Чачэвічах сакратары не прашлі, а прашлі іншыя аўторытэтныя таварышы).

Але ж гэта выпадкі... У грунтоўных, у грамаднай большасьці організацыі дэмократыі комсамольскія комітэты захавалі.

І дзякуючы гэтаму, дзякуючы таму, што не пужалі, не „прапанавалі“ мы маем:

У Кармянскім раёне ў 13 ці ячэйках па справаздачам бюро выказалася 75 таварышоў;

У 9 ці ячэйках Журавіцкага раёну выказалася 42 таварышы;

У 5-ці ячэйках, Лупалаўскага раёну выказалася 39 таварышоў.

І думкі гэтых таварышоў у большасьці былі грунтам для дырэктыў уноў абраным бюро. А гэтыя дырэктывы маюць лепшы зьмест у параўнаньні з вясеньнімі перавыбарамі.

Абнаўленьне 47—38 проц.

І перавыбары закончыліся... Склад бюро ячэек значна абнавіўся.

У вёсцы на 43 проц., у заводзкіх яч. на 61 проц., местачковых на 50 проц., у саўхозкіх на 38 проц.

Ці нормальна гэта? Пасьля прызыву, пасьля пасылкі на вучобу—нормальна. Настрою „пабыў у бюро—аслабаняй месца“ ў ячэйках няма.

Сакратароў з 190 усіх уноў абраны 73 чалавекі.

Паменьшыўся ў агульным ліку парт'асяродок у складзе бюро ячэек на 11 чалавек, што тлумачыцца ўходам у арм ю вялікай часткі парт'асяродку, 1904 году нараджэньня.

Процант дзяўчат у бюро ячэек павялічыўся толькі на 0,5 проц. і іх проц. усяго 16, што не адпавядае агульнаму проценту (17,5 проц.)

«У бюро быць цяжка»

Здам комсамольскі білет, калі абяруце“—прад'явў ультыматум сябра адной ячэйкі Магілеўскага раёну. Частка сакратароў ячэек катэгорычна адмаўлялася быць у бюро ячэек—„ім вельмі цяжка“!

Шмат момантаў ня прыва6леньня да працы ў бюро ячэек комсамольцаў —самастойных гаспадароў—„ім некалі, ім патрэбна гаспадарыць“.

Значна паменьшыўся лік грамадзкіх працаўнікоў у складох бюро ячэек (на 20 чалавек).

Нашы прапановы.

1. Наступную перавыбарную кампанію рыхтаваць пад пунктам погляду ажыўленьня ячэйковай працы і праверкі ўсіх ранейшых дырэктыў, якія былі даны бюро, з тым, каб на перавыбарах падводзіліся вынікі подугадовай працы ячэйкі.

2. Падрыхтоўку пачаць з тым разьлікам, каб сама ячэйка да перавыбараў рыхтавалася на працягу месяца.

3. Забясьпечыць ячэйкі ў час перавыбараў прадстаўнікамі Райкомаў —сябрамі бюро РК, каб апошнія на грунце папярэдняга абгляду ячэйкі ёй дапамаглі, у справе праверкі і намячэньня далейшых задач.

4. Больш рашучае вылучэньне накіруючую працу сяброў КСМ—маладога ўзросту, з тым, каб у складох бюро больш ня было 18,6 проц. старэй 23 х гадоў.

5. Устанаўленьне ўсюды справаздачнасьць да перавыбараў ячэек КСМ у парт'ячэйках, аднначасова дамагаючыся прысутнічаньня і ўдзельнічаньня прадстаўнікоў ад ячэяк КПБ у перавыбарчых сходах КСМ.

6. Устанаўленьне штодзенай больш таварыскай дапамогі з боку Райкомаў ўзноў вылучаным сакратарам ячэек, маючым малую падрыхтоўку і практыку ў працы. Фалкін—Даўро

Практыка маладых гаспадароў

Комсамольцы сур'езна бяруцца за паляпшэньне сваіх гаспадарак

Нашы дасягненьні і далейшыя задачы

(Ліст з Віцебску).

Пра агрономічную прапаганду вясковага комсамолу Віцебшчыны за мінулы летні час можна сказаць наступнае:

Значна палепшыліся адносіны комсамольцаў да працы ў сваіх гаспадарках. Сяляне вельмі рэдка ўжо адзываюцца аб сяброх ячэек як аб гультаёх. Ёсьць выпадкі, калі дарослыя сяляне хваляць комсамольцаў, ставяць ў прыклад усёй беспартыйнай моладзі. Добрыя адносіны комсамольцаў да працы ў сваіх гаспадарках нават часткова дрэнна адбіліся на выконваньні саюзных абавязкаў.

Не зьяўляючыся кіраўнікамі гаспадарак, комсамольцы-сябры сем'яў зьяўляюцца штурхачом да лепшага. Ёсьць шмат выпадкаў, калі па почыну комсамольцаў земляўпарадкаваліся вёскі, організоўваліся пасёлкі, уводзіўся шматпольны севазварот і г. д.

Комсамольцы—самастойныя гаспадары ў большасьці жывуць яшчэ ў неўпарадкаваных вёсках і перавод зіць сваё поле на лепшыя формы земляўпарадкаваньня ня могуць. Гэтыя таварышы, галоўным чынам, вядуць агітацыю за правядзеньне земляўпарадкаваньня сваё вёскі.

У гэтай працы ёсьць некаторыя посьпехі.

Самастойныя гаспадары—комсамольцы свае гаспадаркі на шматпольле перавелі: у Лёзьнянскім раёне—3 таварышы, у Сіроцінскім—2, у Суражскім—2, у Сененьскім—4, Гарадоцкім—5 і г. д.

Сельска гаспадарчыя гурткі ў летні час амаль, што спынілі сваю працу. Тлумачыцца гэта адлучэньнямі кіраўнікоў і летнімі палявымі працамі. Неабходна адзначыць, што веды атрыманыя ў гуртках зімою, часта ўжываліся на практыцы (правільнае кармленьне жывёлы, пасеў канюшыны, рэалізацыя малака і г. д.)

Тое самае датычыцца і сельскагаспадарчых курсаў, на якіх навучалася значная колькасьць комсамольцаў.

Зараз с.-г. гурткі зноў распачынаюць сваю працу, але аднастойнай праграмы ў іх яшчэ няма.

Праводзячы агрономічную працу нашы організацыі з агрономічнымі сіламі зьвязаліся слаба. Ня ўсе райкомы зьвярнулі ўвагу на прыцягненьне ячэек да працы раённых сельскагаспадарчых саветаў.

Прад комсамольскімі організацыямі ў зімку стаяць наступныя задачы:

дасканалае вывучэньне становішча гаспадарак комсамольцаў—самастойных гаспадароў і распрацоўкі практычных мерапрыемстваў для іх паляпшэньня; разгарненьне працы сельска-гаспадарчых гурткоў, прыцягваньне комсамольцаў на сельскагаспадарчыя курсы, організацыя шэрагу гутарак і дакладаў па агрономічным пытаньням, удзел ў працы сельска гаспадарчых саветаў і г. д.

Уся праца пав'нна ўзгадняцца з зямельнымі сэкцыямі сельскіх саветаў.

Да працы неабходна прыцягнуць агрономію і іншых культурных працаўнікоў.

Гарадзкія шэфскія організацыі павінны падумаць аб задавальненьні сваіх „падшэфнікаў“ патрэбнай сельска гаспадарчай літаратурай.

Акрпол тасьвет разам з агрономіяй павінны выпрацаваць прыстасаваную да віцебскіх умоў праграму сельска гаспадарчага гуртка.

М. Заліксон.

Школьныя заданьні выканалі

(Вільшчынская ШСМ, Койданоўскі раён).

Пасьля скончаньня летніх водпускаў- часу адпачынку і практычнай працы на гаспадарках бацькоў—вучні нашай школы зноў зьехаліся ў Вільшчына, каб яшчэ больш запасьціся тэоратычнымі ведамі па сельскай гаспадарцы.

Калі прыглядзецца да тае працы комсамольца, што ён зрабіў дома, дык пераканаемся, што ўсе тыя абавязкі, што даваліся школай дзеля летняй практыкі—выкананы.

Напрыклад, возьмем комсамольца вёскі Ліве, Койданоўскага раёну, Чэча Паўлюка, які дома вёў практыку з капустай, буракамі і іншаю гароднінай.

Садзіў капусту ён так: прабіваў дзіркі на градзе адна ад другой ... аршыы, у гэтыя дзіркі наліваў вады пасьля браў каліва капусты, абмочваў у раствор кароўяга памету гліной і садзіў у зробленую ямку вадой, а зьверху крышку прыкрываў тонкім пласьцікам зямлі. У летні час ён падліваў капусту жыжай з гноем разбаўленай вадой 3/4 вады і ... жыжы. Буракі і іншыя расьліны пасыпаў попелам.

Калі паглядзелі сяляне, а таксама і вясковае настаўніцтва на гэту працу, дык сказалі, што як засяваецца наша вёска—такой капусты ня бачылі.

Юнкор Мікола Васілец.

Навучыўся сам і другіх навучыў.

(Клятчыцкі сельсавет, Ульскі раён, Полацкая акруга).

Я надта зацікавіўся сваёй гаспадаркай і яе паляпшэньнем. Яшчэ ў 1924 годзе пасеяў канюшыну на кавалку ў 6 саж. шырыні і 40 саж. даўжыні.

Вырасьціць канюшыну на гэтым кавалку было досыць цяжка.

Часта гаварыў сялянам аб каштоўнасьці канюшыны, але ніхто ня верыў і казалі, што нам няма дзе сеяць жыта, а ня толькі канюшыну.

Але, калі ўбачылі якая вялікая канюшына парасла на маім кавалку —погляды гаспадароў перамяніліся, пачалі казаць—„лепш частку зямлі засею канюшынай, чым зярновымі расьлінамі, дык менш працаваць прыдзецца і будзе больш карысьці.

Комсамолец А. Х.

Прыпеўкі.

На сьцяне вісяць портрэты
І вісіць адзін плякат.
Пабудую гаспадарку
Я сваю на новы лад.

Што мне хлопцу маладому
Цяжкім горам гараваць:
Куплю трактар сабе новы—
Буду поле ім араць.

У полі ветрык ціха веяў
Над балотам гай шумеў.
Комсамолец Ян Андрэяў—
Уцяпліў назіму хлеў.

Эх, ты поле, мае поле,
Усё шырокае, бяз мяж.
Тут пасеяў я пшаніцу,
А ты мілачка пажнеш.

Паглядзі, што зараз скажа
Наш савецкі каляндар.
„Уся зямля бяз гальбы наша
А ёсьць дрэнны гаспадар“.

Вецер носіць у паветры
Пажаўцелы сухі клён.
Вазьму кніжку пачытаю,
Як патрэбна сеяць лён.

С. Бульбянік.

Ратуйце ад воўкоў!

(В. Харавічы, Сьмілаўскага раёну, Меншчына).

Цэлымі чародамі ходзяць ваўкі каля нашай вёскі. І ня дзіва, калі ў якога небудзь гаспадара задушаць карову, ці сьцягнуць авечку.

Ня так даўно ваўкі задушылі карову і трох падсьвінак. Кожную ноч ходзяць па вёсцы, падкопваюцца ў хлявы ды душаць авечак. Шкада, што на гэтае зьявішча належныя ўстановы не зьвяртаюць ўвагі.

Пчолка.

Развучы да Ленінскіх дзён.

Ці ўсё мы зрабілі.

(Па наказу Ільліча).

Жывы даклад для рабоча-сялянскай моладзі. Выкарыстаны матар'ялы: 1) Прамова Леніна на III зьезьдзе РЛКСМ; 2) Вершы і комсамольскія сьпевы.

Тры званкі. Адчыняецца заслона. На сцэне моладзь дзелавіта бяз клопату, закончвае расстаноўку сьцягаў плякатаў і прыбірае бюст альбо портрэт Ільліча—на сярэдзіне сцэны.

Першы-На што заслону адчынілі?

Другі-Хто там каля заслону? Зачыні назад!

Агітпроп-арганізатар (уваходзячы) Ну, хлопцы, пачынаем.

Галасы-Як пачынаць.
Ды што ты.
А яшчэ агітпроп-арганізатар.

Агітпроп-А ў чым-жа затрымка? Народу поўна.

Першы-Дакладчык прыехаў?

Агітпроп-Па якому пытаньню вам быў патрэбен дакладчык?

Першы-Ты што, з неба скаціўся? Даклад «Як мы выпаўняем заветы Ільліча».

Агітпроп-Скажу проста: дакладчыка я ні адкуль ня выклікаў. І нават не зьбіраўся.

Голас-О ой...

(Агітпроп зварочваецца да перапужаных хлапцоў, якія сабою паўкола) ўтварылі—Дакладчык на месцы. Давай пачынаць!

(Усе ўзіраюцца, пераглядваюцца)
Дзе дакладчык?
Хто дакладчык?
Зьнік, ці што?

Агітпроп-Актывісты з . . ячэйкі (назва ячэйкі)—Тут, на сцэне.

Агітпроп-Актывісты з . . ячэйкі (назва) Тут, тут.

Агітпроп-Хто там у нас у культкамісіі. Комсамолец? Асьлёп, ня бачыш?

Агітпроп-І піонэры тут.
Мы першыя.
Бачыш — Ільліча як прыбралі (паказвае на бюст)
Мы тут з трох гадоў працуем.

Агітпроп-Ну, а комсамольскія эконом-працаўнікі?

Становячыся ў фронт-Заўсёды на месцы, таварыш агітпроп! Як з кулямёта.

Агітпроп-І дзявочы актыў тут-як тут!
Ды ўжо-ж, бяз нас не абыйдзецца

Першы-Слухай. Што тут за валынка? Дзе-ж дакладчык, на самай справе?

Агітпроп-Дай справу скончыць. Старшыня юнсэкцыі! Альле!
(Старшыня юнсэкцыі з другога канца крычыць)
Альле!

Агітпроп-Ідзі сюды!

Старш. Ю. С.-Не праціснуцца. Што трэба?

Агітпроп-Дзе твае гурткі?

Старш. Ю. С.-Пакліч, самі адгукнуцца.

Агітпроп-Духавы, дзе ты?
(Духавы оркэстр дае сыгнал).

Агітпроп-Такс с. На месцы. Харавы ідзі на сцэну!
(Харавы гурток, стаўшы ў першых шэрагах, накіроўваецца з песьняй на сцэну!:

Гэй комсамолія наперад марш,
Барацьба і праца—лёзунг наш!

Першы-Ты ўсё-ж такі скажаш нарэшце—дзе твой дакладчык?

Агітпроп (сьмяючыся) Ты яшчэ ня бачыў яго? Вось ён!

Першы-Я!

Агітпроп-І ён, і ён, і яна, і духавік, і харавы—вось наш колектыўны дакладчык. Мы самі скажам, як мы выконваем заветы Ільліча, хто лепш за нас ведае аб гэтым.

Першы-Дык я-ж не падрыхтаваўся!

Агітпроп-А тры гады пасьля яго сьмерці—хіба-ж ты не працаваў каля станка і ў Комсамоле?

Першы-Факт.. Вядома працаваў.

Агітпроп-Вось гэта і ёсьць падрыхтоўка да дакладу. Хто супярэчыць хлопцы? Ці ж гэта ня так?

(Духавы дае сыгнал—фанфару).

Хор—
Усё жыцьцё сумеем мы
Аддаці барацьбе
І справу Леніна,
І імя Леніна
Вазьмем сабе.

Усе на сцэне-(і духавы арк. матыў „Кавалі").
Мы комсамольцы, маладыя
Мы сілы працы аддаем
Ня страшны нам ворагі злыя
Жыцьцё мы новае куем, куем,
куем...

Першы-Тое, што ў нас называюць дзівам,

Першая-Тое, што лепшае ў кожным з нас.

Усе актывісты:
Гатовы мы да барацьбы
За справу УсеКП.
І з тых часоў як сталі мы
Насьледнікамі Леніна.

Агітпроп-На 3-м зьездзе Эр-Ка-Эс-М, у суровы, бушуючы кастрычнікавым ветрам, дзень галоднага 20-га году, Ільліч з комсамольскай трыбуны, цьвёрдай рукой паказваў нам шлях наперад скрозь 10-цігодзь дзя барацьбы і будовы.

Першы-Хто пабудуе комуністычную грамаду?

Агітпроп- Таму пакаленьню, прадстаўніком якога цяпер 50 гадоў, нельга разьлічваць, што яно пабачыць комуністычную грамаду.

Першы - А тое пакаленьне, якому зараз 15 гадоў яно і пабачыць комуністычную грамаду і само будзе будаваць гэтую грамаду.

Другі - Што павінна рабіць моладзь дзеля гэтага зараз.

Агітпроп - Задачы моладзі наогул... і Саюзу Комуністычнай Моладзі ў прыватнасьці... (зварочваецца да актывістых).

Першы - Можна выказацца!

Першая - Адным словам,

Другі - Задача складаецца з таго.

Другая - Каб...

Усе актывісты я—Вучыцца!

Трэці - Як вучыцца?

Трэцяя - Чаму вучыцца?

Агітпроп - Вучыцца комунізму!

Чацьвёрты-Што-ж трэба зрабіць дзеля таго, каб навучыцца комунізму?

Чацьвёртая-Што-ж нам вылучыць з скутку агульных ведаў, каб набыць веды комунізму?

Голас (вельмі граматны) — Навучыцца комунізму, па маему, — гэта значыць—прачытаць некалькі комуністычных падручнікаў і некалькі брашур!

Голас (Жаночы, вельмі граматны) - Ах, не, зусім ня так! Трэба на зубок вывучыць усе комуністычныя кнігі, так вывучыць, каб сплючы калі пабудзяць і запытаюць любы лёзунг, адгрымець!

Першы - Вось гэта так. Калі так навучыцца,—тады раз, два — і комунізм—збудаваны! Ран'цаю падмурак залажыў, а к вечару страху прыбівай!

(Выходзіць вельмі граматны хлапец з вялізным портфэлем, у акулярах і такая-ж дзяўчына).

Агітпроп—Калі-б толькі вывучэньне комунізму заключалася ў вывучэньні таго, што складзена ў комуністычных кнігах і брашурах—лёгка мы маглі б атрымаць комуністычных начотчыкаў!

Першая.-І хва-сту-ноў!

Першы-Бяз працы!

Другі-Без барацьбы! (паказваючы на вылезшых «добра граматных»)

Агітпроп-Кніжныя веды комунізму...роўна нічога ня варты.

Першы-Яшчэ больш небясьпечна, было б, калі-б мы пачалі вывучаць

Першая-толькі

Агітпроп - Комуністычныя лёзунгі!

Вельмі граматны-што-ж нам узяць с старой навукі?

Вельмі граматная-...Старая школа—была школаю—муштры.

(Зьяўляецца адзеты ў мундзір гімназісты. Ідзе хутка, за плячыма вялізная кніга, ён яе ледзь нясе).

Вельмі граматны-Старая школа—школа зубрыстыкі.

(Гімназіст ледз зьнімае кнігу, адчыняе яе і пачынае па ёй чытаць—зубрыць. мармычучы).

Вельмі граматная-кожнае слова гэтай школы было падроблена.

Абодвы-У інтарэсах буржуазіі!

(Выходзіць самаздаволены буржуй, прыслухоўваецца, рад, падыходзіць да зубрыстыка, крадучыся з-заду, зачыняе вочы гімназісту рукамі. Той спужаўся.

Буржуй-Гэта я! Вучы, вучы на памяць, як отчэ наш!

Галоўнае-каб нашу навуку і з зачыненымі вачыма, на памяць!

Першы-Якая розьніца паміж імі?

(Паказвае на вельмі граматных, буржуя і гімназіста).



Усе актывісты- Ні-якай!

Першая - А што аднолькавага ў іх?

Агітпроп - Толькі начытаўшыся кніг-ня змогуць аб'яднаць усе гэтыя веды з жыцьцём.

(Вельмі граматны і буржуй з гімназістым вітаюць адзін другога. Духавы грае вясёлы марш. Яны двума парамі-гімназіст і вельмі граматны, буржуй і вельмі граматны шляхетна ўступаючы адзін другому дарогу выходзяць пад музыку падскакваючы).

Агітпроп - Трэба ўмець выбраць з старой навукі тое, што неабходна для комунізму!

Хлопцы-актывісты я-Бо мы можам будаваць комунізм толькі з скутку ведаў,

Актывісткі-дзяўчаткі - сіл і сродкаў,

Першы - Якія засталіся нам ад старой грамады,

Другі - А на месцы старой муштры... мы ставім сьвядомую

Першая - дысцыпліну,

Дзяўчата-актывісткі - рабочых

Хлапцы-актывісты я-і сялян,

Агітпроп - якія злучаюць з ненавіджаньнем да старога

Усе хлопцы (актыў і хор)-Рашучасьць

Першы - Умеласьць

Усе дзяўчата (актыў і хор) - І гатоўнасьць

Агітпроп - Аб'яднаць і арганізаваць сілы для гэтай барацьбы!

Усе - стварыць адзіную волю,

Першы - бо бяз гэтай адзінай волі мы будзеу пабіты.

Усе дзяўчаты- ня-м! ну чэ!

Хор - Калі на вучобу пашоў—
падцягніся,
Помні заўсёды—вучы ленінізм.
Пад цяжкасьцю працы ніколі ня гніся,
А песьняй юнацкай заўсёды зьвіні!..

(Гудок. Некалькі перабіваючых адзін другога гудкоў).

Агітпроп - Перад намі задачы гаспадарчага ўздыму краін,

Першы - Перабудаваньне прамысловасьці па новай сучаснай тэхнічнай падставе!

Голас - Як ажыцьцёвіць гэтыя задачы?

Агітпроп - Іх можна вырашыць толькі аўладаўшы ўсімі сучаснымі ведамі,

Першы - Умеючы ператтварыць комунізм з завучаных формул.

Другі - Парад

Першая - Рацэптаў,

Другая - Прадпісаньняў,

Трэцяя - Програм,

Агітпроп - У кіраўніцтва для нашай практычнай працы!

Першы - Зьяднаць веды з нашым жыцьцём!

Агітпроп - Вядома, мы павінны для гэтага выхоўваць новага чалавека!

Другая - У чым сутнасьць новага выхаваньня?

Агітпроп - Новае комуністычнае выхаваньне—у барацьбе супроць эксплёататараў!

Першы - Супроць...

Зьяўляецца хлапец з папяросаю ў зубах:

— Я дамагаюся свайго прыбытку, а да ўсяго іншага мне няма ніякае спра-вы! Ха-ха-ха—Цьфу! (плюе і выходзіць).

Духавы аркэстр грае ганебны акорд.

Агітпроп - Трэба, каб усе ўбачылі

Першая - Што?

Другі - Усякі комсамолец

Другая - Зьяўляецца граматным.

Усе хлопцы - А разам з тым умее і працаваць!

Колектыўны рух, які характарызуе працоўны момант, у вытворчасьці, у гаспадарцы, пад музыку аркестру.

Усе дзяўчата - Жыцьцё маё,—

Усе хлапцы - Растучы мур!

Першая - А-ну—

Першы - Узарві, паспрабуй?...

Дзяўчата - Сэрца маё—завод

Хлапцы - мозг мой—рабфак,

Усе - Вучоба!

Агітпроп - (Аркэстр) перастае граць. Наш быт—падпарадкаван клясавым інтарэсам пролетарыяту.

Дзяўчата - Быт—

Першая - Гэта тое, што дапамагае—

Хлапцы - Разбурэньню старай грамады

Усе дзяўчата - І аб'яднаньню

Усе хлапцы-Усіх працоўных вакол пролетарыяту, які стварае грамаду комуністых.

Першы (Духавы—моцны стук па талерцы] (Выходзячы наперад)—Усё гэта так. Але вось пытаньне—пытаньняў—таварышы, увага!

Агітпроп-Пакаленьне, якое праз 10—20 гадоў будзе жыць у Комуністычнай грамадзе, павінна ўсе задчы свайго вучэньня, свэёй працы ставіць так, каб кожны дзень у любой вёсцы, ў любым горадзе—

Хлапцы актывісты-Моладзь вырашала практычна тую ці іншую—

Дзяўчаткі актывісткі-Задачу агульнай працы!

Першы-Няхай самую маленькую—

Другія-Няхай самую простую (Барабанная трэль. Уваходзяць піонэры. [сьпяваюць]

— Мы піонэры юныя—
Кастрычніка сыны
У цяжкай нашай працы
На сьвет зьявіліся мы.

Першы піонэр.-У працы і ў клюбе за кніжкаю. Мы гарым юнацкім агнём.

Усе піонэры. Надзейся на нас, комсамолец брацішка мы зьмене на зьмену ідзем.

Агітпроп. Зьмена зьмене—гатова!

Піонэры.-Заўжды, заўжды гатова!

Агітпроп-Ну, раз гатовы, засьпяваем разам: (сьпяваюць „Маладая гвардыя").

Уперад зару спаткаем
Сябры ў барацьбе.
Карцеччу і штыкамі.—
Пралажым шлях сабе...

Агітпроп. Пытаючыся ў сябе:

Ці ўсё мы зрабілі, каб быць аб'яднанымі сьвядомымі працоўнымі пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі.

Усе. Будзем. як раней ў працы і барацьбы. Дружна і ў ногу ісьці з УсеКП.

Выходзіць аркэстр. Пад яго гук—усе ўдзельнікі разгортваюцца на сцэне. Уваходзяць фізкультурнікі з песьняю.

(Пяюць на матыў „Мы піонэры юнныя)".

Мы моцныя. здаровыя,
Да працы, барацьбы.
За Ленінскую справу
Гатовы заўсягды!

Актывісты, хор, піонэры, фізкультурнікі, будуюць піраміду — жывую карц'ну навокал бюста Леніна. (Пяюць пад аркестр).

Матыў: „Белая армія".

Бо ад тайгі да брытанскіх марэй
Мы комсамолія ўсіх мацней.
У нас юнных Ленінцаў,
Адвага пеніцца,
І пойдзем мы ў апошні бой,
Мы бяз буржуяў, жыцьцё збудуем
Сваёю працай, барацьбой.—
(2 разы)

[Заслона].

А Александровіч

Адрыўкі з поэмы „Комсамол".

* * *

Мяцеліца сьцелецца сьнежнай далінай,
Зямля—серабрысты паркаль...
Трывожна гудуць правады бязупынна
Ветры разносяць жаль.
Мяцеліца сьцелецца бурай усьпененай,
Злосьцю заўзятай мігае ў вачох.
Таварышы! Утрата! ..
Ня стала Леніна!
Леніна—
Ільліча.

* * *

На крамлеўскай званіцы-вежы
Гадзіньнік чатыры прабіў...
Над магілай пажоўкла сьвежай
Своц сьцяг комсамол пахіліў...

* * *

Суму ня трэба! Ня трэба жалю!..
А сэрца балюча шчыміць...
Дарагога свайго Ільліча пахавалі;
Ленін мільёны—будзе жыць!

* * *

Беласьнежным праменьнем
Лжа каменьні
Мароз, рассыпаючы сьнег белай жменяй.
Сэрца ня змоўкла... Не зьледзянела,
Вуліцай белай
Плача нясьмела.
Іскрамі смутку плача маўкліва
Сэрца юнацкае, сэрца віргівае.
Сьнег засьцілае бельлю каменьні...
Гэй, комсамольцы,
шчыльней
свае зьвеньні!



Голас „Парыскай Комуны“.

(Гутарка з сакратаром комсамольскага колектыву „Парыскай Комуны“ дэлегатам пленуму ЦК ЛКСМБ тав. Кузьняцовым).

У параўнаньні з мінулым годам праца ЛКСМБ па шэфству над лінкорам «Парыская Комуна» пасунулася некалькі наперад. Узаемная перапіска дасягнула некаторай рэгулярнасьці. Сярод акругоў Беларусі першае месца па перапісцы з намі і наогул сувязі займаюць Бабруйская і Полацкая. Акрамя перапіскі паміж намі і беларускай організацыяй практыкуецца яшчэ і жывая сувязь—абмен прадстаўнікамі.

Трэба адзначыць, што матар'яльная дапамога лінкору кульгае. Пастанова ЦК ЛКСМБ аб штомесячнай ярысылцы нам 90 руб., на жаль не праводзіцца ў жыцьцё. З другога боку некаторыя акругі, як Менская, Віцебская, Калінінская прысылалі нам грошы бяз ведама і паміма ЦК. Гэтае ненормальнае зьявішча тлумачыцца слабой сувязьзю паміж цэнтральнай і акруговымі камісіямі па шэфству. Патрэбна цэнтралізацыя ўсіх сродкаў зьбіраемых дзеля нас і непасрэдная іх прысылка нам ад ЦК ЛКСМБ. Усяго за апошнія 8 месяцаў мы атрымалі 335 руб. і літаратуры 120 экз.

Чырвонафлётцы скардзяцца на тое, што ў мясцовым комсамольскім друку («Чырвоная Зьмена» і інш.) мала зьмяшчаюць матар'ялу аб жыцьці лінкору і аб становішчы працы па шэфству на тое, што наогул шэфства праходзіць слаба.

Што патрэбна зрабіць дзеля ажыўленьня шэфства?

Патрэбна большая популярызацыя сярод беларускай комсамоліі ідэі шэфства, бо некаторыя ячэйкі нават ня ведаюць аб тым, што існуе падшэфны лінкор.

Трэба дамагчыся, каб кожная ячэйка вылучыла спэцыяльнага ўпаўнаважанага па сувязі з намі. ЦК ЛКСМБ павінен абменьвацца з намі протаколамі, рэгулярна прысылаць абяцаныя грашовыя сродкі і г. д.

У сувязі з далучэньнем да Беларусі Гомельшчыны, мы чакаем значнага ажыўленьня шэфскай працы, бо Гомельская організацыя сябе ўжо добра зарэкомэндавала пры шэфстве з раней прымацаваным да яе караблём.

Я. З.

Колькі чалавек у тваей акрузе?

Па матар'ялам усеагульнага перапісу 1926 г. колькасьць насельніцтва ў акругох БССР наступная:

Бабруйская акруга: вясковага насельніцтва—433.974 чал., гарадзкога насельніцтва—96 852, усяго—530.826 чал.

Барысаўская акруга: вясковага насельніцтва — 333 742, гарадзкога—46.499, усяго—380.241.

Віцебская акруга: вясковага насельніцтва — 457 075, гарадзкога — 123 690, усяго—580 765.

Калінінская акруга: вясковага насельніцтва — 337 592, гарадзкога—36 160, усяго—373.742.

Менская акруга: вясковага насельніцтва—378 713, гарадзкога—158.987, усяго—537.700.

Магілёўская акруга: вясковага насельніцтва -- 448.591, гарадзкога -- 80.350, усяго--528.950.

Мазырская акруга: вясковага насельніцтва -- 292.092, гарадзкага -- 37.516, усяго--329.698.

Аршанская акруга: вясковага насельніцтва--361.333, гарадзкога 55.849 усяго---417.182.

Полацкая акруга: вясковага насельніцтва--286.156, гарадзкога -- 37.421, усяго--323.577

Слуцкая акруга: вясковага насельніцтва--277.739, гарадзкога--31 622, усяго--309 352.

Усяго па БССР (апрача Гомельскай і Рэчыцкай акругі, весткі ад якіх яшчэ не атрыманы): сельскага насельніцтва--3.606.988 чал., гарадзкага--704.955, агульная колькасьць насельніцтва--4.311.943 чал.

У тры радкі:

Пленум усебеларускай конфэрэнцыя па грамадазнаўству склікаецца БДУ у сярэдзіне лютага.

Інстытут соцыяльнага перавыхаваньня для дзяцей адчыняецца вясной г. г. у Слуцкай акр. Інстытут разьлічан на 100 чал.

Эсперантысты БССР сьвяткуюць 15 студзеня 30-я гады іх існаваньня саюзу. Усяго іх на Беларусі цяпер 1000 чал. (100 гурткоў)

4 мільёны руб. еу на вясеньнюю пасеўную кампанію 1927 г. адпушчае урад БССР на усе акругі. Будуць вагатоўлены с.—г. машыны і прылады.

Драматургічныя сэмінары організуюцца у Менску для культработнікоў вескі у пачатку весны.

Рада-перасоўкі у хуткім часе накіроўваюцца для працы у глухіх вёсках Мазыршчыны і Аршаншчыны.

Аўторак, чацьвер і субота...

У Менску 200 беспрацоўных падросткаў

У юнсэкцыі пры Менскай Біржы Працы нагледаецца наплыў беспрацоўных падросткаў горада і вескі. Усяго іх зараз каля 200 чал. (прырост за год на 20 проц.).

Галоўную частку гэтых падросткаў складаюць чорнарабочыя і моладзь саюзу будаўнікоў (з-за наступу зімовага сэзону).

Юнсэкцыя робіць захады да накіраваньня у бліжэйшым часе часовы беспрацоўных на прадпрыемствы. У працягу сьнежня атрымалі працу усяго 27 юнакоў (у лістападзе—45 чал.)

Для беспрацоўных падросткаў організуюцца курсы політграматы.

Дні яўкі беспрацоўных у юнсэкцыю—аўторак, чацьвер і субота (9-12 гадз. раньня).

Запытаньні і адказы

ЗАПЫТАНЬНЕ № 752. (Янкі) Ці мае права поп, прышоўшы зьбіраць каляду, прымушаць комсамольцаў зьнімаць шапкі, у часе малітвы і ці можна яго прыцягнуць да адказнасьці за гэтага. Ен кажа, што за парушэньне рэлігійных абрадаў даюць 3 годы турмы?

АДКАЗ Згодна крымінальнаму кодэксу поп наогул ня мае права хадзіць па хатах зьбіраць каляду. Дазваляюцца толькі добраахвотныя ахвяраваньні у малітвенным доме. Таксама поп ня мае права прымушаць комсамольцаў зьнімаць шапкі. Але з другога боку, ня трэба комсамольцам зьдзекавацца над рэлігійнымі абрадамі. Трэба іншым шляхам весьці антырэлігійную працу.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 753. (Андрэенка). Які адрас рэдакцыі часопісі «Полымя».

АДКАЗ. Гор. Менск, Савецкая 63, часопісь «Полымя»

ЗАПЫТАНЬНЕ 754. (А.) Які адрас рэдакцыі часопісі «Маладняк»?

АДКАЗ Менск, Рэволюцыйная 21, Ц. В. «Маладняка»

ЗАПЫТАНЬНЕ № 755. (Н.) Ці можа партыйны застацца на від ...?

АДКАЗ. Яму гэта павінна зрабіць праз комсамольскую ячэйку.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 756 (С.С.) Ці можна комсамольцу гуляць у лато?

АДКАЗ Гэта не забараняецца але ня трэба рабіць гульню азартнай.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 757. (Ар. М.) Ці выпрацавана праграма для васту леньня у навучальныя установы у 1927—28 навучальным годзе?

АДКАЗ. Праграма яшчэ не надрукавана. Яна будзе надрукавана прыблізна у лютым месяцы.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 758 (З.) Ці мае права вясковая ячэйка ЛКСМБ прымаць тавары па другі раз у Коопэрацыі?

АДКАЗ. Мае права.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 759 (Сел. К—ц.) Ці абавязкова павінен наведваць пленумы райкому КСМ кандыдат райкому?

АДКАЗ Кандыдат райкому павінен наведваць усе пленумы РК.

Суд.

Гвалтаўнік

Міхасю Шапецка—20 год. Ён цёмны няпісьменны селянін. У яго чорняя, гладкаабстрыжаная галава дзесьці на ілбу сядзяць хітрыя, бязколерныя вочкі.

Ён ня прызнае сябе вінаватым у згвалтаваньні 10 ці гадовай Парасакі Салатай. Па яго словам усё было па ўзаемнай згодзе.

Дзяўчынка Параска—яго „старая знаемая“. Ён з ёй часта сустракаўся на сенажаці, дзе яна пасла скаціну.

У той памятны дзень 4 верасьня мінулага году ён убачыў Параску каля шырокай дарогі, якая вядзе ў вёску Скрыль (Менскай акругі і тутжа яе згвалтаваў.

Вось што расказвае пра гэту жудасную гісторыю маленькая, дзяўчынка з яснымі вочкамі і вузкімі плечыкамі, якія схаваны ў доўгім „бацькаўскім кожуху.

„Гэты злы чалавек, які сядзіць на лаве падсудных, гаворыць яна, паказваючы пальчыкам на падсуднага, даўно ўжо ганяцца за мною. але я звўсёды ад яго ўцякала. Аднойчы, гэта было ўлётку, я пасла скаціну і ад жары заснула пад кустом. Калі я прачнулася каля мяне стаяў гэты чалавек з абрэзам у руках.

Я стала крычаць і клікаць на дапамогу матку, але ён мяне ня выпушчаў.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Міхася Шапецка да 5 г. турэмнага зняволеньня, але прымаючы пад увагу яго першую судзімасьць і нізкі культурны ўзровень, зьнізіў яму кару да 3 год.

Ф.

Ордэр

Падсудны Бульчык працаваў дзелаводам у Белдзяржвыдавецтве. У яго абавязкі ўваходзіла выпісваць выдатковыя ордэры на розныя матар'ялы, якія атрымоўваліся з цэнтральнага складу. Доўгі час Бульчык працаваў чэсна і быў задаволены сваёй пэнсіяй. Але, аднойчы, пад уплывам прыяцеля, які жыў на многа лепей яго, парашыў „падпрацаваць“. Доўга думаў ён—як тут быць, і нарэшце парашыў зрабіць падлог: выпісаць ордэры мiфічнага пакупацеля, атрымаць тавар і прадаць яго на прыватным рынку. Доўга абдумваў Бульчык падрабязнасьці злачынства. І калі быў гатоў, ён выпісаў сябе біблы на суму каля 800 руб., атрымаў тавар і прадаў яго ў Рамнях. Усё прашло гладка. Бульчык стаў думаць аб тым як-бы зарабіць яшчэ крыху грошаў. Выпісаць са складу яшчэ тавару ён не адважаўся. Тады ён рашыў выкарыстаць на свае патрэбы профсаюзныя грошы, якія ў яго былі, як у зборшчыка сяброўскіх узносаў.

Пасьля таго, як Бульчык пасьпеў страціць 100 руб. з профсаюзных грошаў; прыбыла рэвізыя і выкрыла растрату. Сталі правяраць усю работу Бульчыка і тут выявілася, што ён яшчэ зрабіў падлог.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Бульчыка да 1 году турэмнага зняволеньня.

Грамадзянскі іск Белдзяржвыдавецтва ў суме каля 800 руб. суд пастанавіў здаволіць.

Ф—р.

Як распаўсюджваюцца лётарэйныя білеты.

На карысьць беспрытульных распаўсюджана лётарэйных білетаў па ўсіх акругах каля 250 000 шт. (па 25 кап.). Усяго належыць іх да продажу—400 000. Апошні тэрмін распаўсюджваньня—1 лютага.

Галоўным недахопам у гэтай важнай працы зьяўляецца тое, што на працягу 2 месяцаў не ўдалося яшчэ па невядомых прычынах закрануць вёску.

«Вёска сьпіць»—адказваюць з месц. А яшчэ правільней—«сьпяць» дзеячы па распаўсюджаньню білетаў.

ЦК Помдэт на аснове вестак з месц запрапанаваў акругам хутчэй зьвязацца з вёскай праз кальцавую пошту.

Адначасна ЦК выпушчае адозву да настаўніцтва аб прыняцьці шчырага ўдзелу ў распаўсюджаньні выйгрышных білетаў.

Вучыцца будзем па праграмах.

Галоўпрофсьвет зацьвердзіў праграмы для вучнёўства на школьнай і дрэваапрацоўчай прамысловасьці.

Гэтыя праграмы прызначаны для планавага навучаньня, якое дасюль вялося безпраграмным спосабам.

* * *

Адначасна Наркамзраўцы распрацаваў матар'ялы аб утварэньні камісій па вучнёўству.

Гэтыя камісіі заменяць сабою ранейшыя нарады, ад якіх было мала карысьці.

Новыя выданьні

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва выпусьціла з друку «Падручнік па політграмаце» (частка II-я) Т. Зямчына-Козлова.

Здадзена ў друк «Рабочая кніга па матэматыцы»—Сацяловіча і Калабуцкага.

Ліст у рэдакцыю

Паважаныя рэдактары!

У № 151 Вашай газэты ад 7-га студзеня г. г. зьмешчана заметка „Павялічваецца вага організацыі“ на аснове мае гутаркі з супрацоўнікам Вашай газэты. У 3-ім слупку, радок другі, гэтай гутаркі, допушчана па віне гутарыўшага са мною вашага супрацоўніка, наступная памылка. У заметцы напісана ў вышэйназваным слупку і абзацы: „Раней год таму назад, удзельная вага парт'асяродку была вельмі мала“. Трэба чытаць: „Раней год таму назад удзельная вага парт'асяродку была некалькі меншая“. У тым жа слупку, радок 3-й, 4-й, 5-й і 6-й зьмешчаны сказ „Парт'асяродак не адчуваў сябе кіраўніком, праз якую партыя ажыўляе свой уплыў і кіраўніцтва комсамольскай організацыяй. Трэба чытаць: „У парт'асяродку было большасьць комсамольцаў партыйцаў, якія не адчувалі сябе кіраўнікамі комсамольскай організацыяй, якія пастаўлены партыяй, і адчувалі менш адказнасьці перад партыяй за комсамольскую працу.

Сакратар Мазырскага Акругкому Комсамолу МАРЧЫК.

Маўклівы клюб.

Хто ня ведае нашы клюбы? Шум, крыкі, топат — сустракаюць цябе яшчэ на парозе. Гэтыя «клюбныя якасьці» знаёмы нам ужо з даўнага часу.

Але ёсьць у Менску адзін клюб, у якім заўжды ціха. Цудоўна ціха. Гэта—клюб глуханямых.



Маўзалей Леніна

... На шырокай Савецкай, каля чыгуначнага моста, у памяшканьні былой царквы яскрава гараць агні. На дзьвярох надпіс на чатырох мовах: „Менскі рабочы клюб глуханямых“. І побач: „Сёньня холадна, калі ласка зачыні дзьверы“.

У клюбе надзвычайная чыстата. Падлога вымыта, падмецена, усюды блішчаць акуратна расстаўленыя рэчы.

Прыкоўвае ўвагу мастацка зроблены маўзалей Леніна, над якім высіцца велізарны малюнак Ільліча, з паднятай рукой. Маўзалей і малюнак зроблены самымі глуханямымі. Яны ўклалі ў гэтыя рэчы многа энэргіі, многа каханьня, многа сапраўднага мастацтва.

Над сталамі, на якіх многа газэт і часопісаў, нахіліліся галавы. Чытаюць, займаюцца. Нішто не парушае глыбокую цішыню.


Гордасьць усіх сяброў клюбу глуханямых—гэта дошка, на якой намалёваны вынікі шахматнага турніру, які быў нядаўна праведзен. Глуханямыя вельмі шчырыя шахматісты. Яны дасяглі ў гэтай галіне вялікага мастацтва. Бывае, што за шахматнымі дошкамі засяджваюцца да позьняй ночы, пакуль сярдзіты вартаўнік не папросіць пакінуць памяшканьне.

За ваным сталом хлапцы стаяць на малкюць № 1 насьценнай газэты „Голас глуханямога“. Зьўгра газэта павінна выйсьці. А матар'ялу ёсьць шмат. Тут і аб занятках гуртка фізкультуры, аб рэпэтыцыях драмгуртка, аб грамадзкай працы ды інш. Газэта не ўладае фізычным недахопам: яна не маўчыць! Аб усіх недахопах і дасягненьнях у працы кожна простач і яскравая мова фактаў.

* * *

Клюб стаў родным месцам для кожнага глуханямога рабочага. Усіх сяброў клюбу 119 чалавек, з іх каля 40 чалавек моладзі. Актыўнасьці клюбнай масы можна пазайздросьціць. Ці выбары ў горсавет, ці даклад аб коопэрацыі, ці справаздача грамадзкага працаўніка—у зале, так і адчуваецца зацікаўленасьць прысутнічаючых, на твары кожнага можна прачытаць яго думкі, яго адносіны да пытаньня..

Гурткі, бібліотэчкі, агульнаадукацыйныя курсы, вялікая праца па палепшаньню бытавых умоў глуханямых—усё гэта кажа, што клюб надзвычайна добра выконвае свае задачы.




Драмгурток рыхтуе спэктакль..

... Калі выходжу з клюбу, група моладзі падае мне пісульку: „як-бы гэта, каб нам прыслалі організатара комсамольскай ячэйкі, жадаем быць у КСМ“.

Бяру пісульку...

Выходжу на вуліцу. Як мага бьюць галавою царкоўныя каланалы. Заклікаюць на малітву. Там чуюць ін шае...

Эд. Галубок.



За вучобай

ПА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

А. Падгорны. Як мы будуем соцыялізм у нашай краіне. 1926

Выдавецтва «Чырвонай Зьмены» выпусьціла шэраг кніжак для комсамольскага чытача па пытаньнях экономікі і гаспадаркі СССР, політыкі і партыі ды інш. Адной з такіх кніжак зьяўляецца рэцэнзуемая брошура.

Пытаньне аб будаўніцтве соцыялізму у нашай краіне у сучасны момант яшчэ служыць прадметам спрэчак сярод некаторых слаёў моладзі. Яшчэ далёка ня усе могуць правільна разабрацца у гэтым досыць важным складаным пытаньні.

На кога мы працуем? Куды ідзе наша краіна—да соцыялізму ці да капіталізму?—вось пытаньні, якія не могуць ня цікавіць рабоча-сялянскую моладзь. Рэцэнзуемая кніжка прадстаўляе сабою спробу даць адказ на гэтыя пытаньні.

І трэба адзначыць, што з сваёй задачай аўтар больш менш справіўся. Разглядаючы гаспадарчы уклад СССР, ён навочна при дапамозе фактаў і лічбаў, даводзіць, што з кожным годам усё больш мацнее наша прамысловасьць і коопэрацыя.

А рост дзяржаўнай прамысловасьці коопэрацыі, паступовае зьмяншэньне ролі прыватнага капіталу, як у гандлі, так і у іншых галінах гаспадарчага жыцьця—сьведчыць, што у нас соцыялістычныя элементы мацнеюць за капіталістычных, што мы сапраўды ідзем да соцыялізму. Гэта праўдзіва кожнаму.

Аўтар даказвае, што як сялянства, так і рабочая клясь аднолькава зацікаўлены у разьвіцьці прамысловасьці, коопэрацыі, узросьце індустрыялізацыі краіны.

Таксама даецца тэматычнае тэнэральнай лініі гаспадарчага будаўніцтва і чарговых задач у гэтай галіне, політыка падвышэньня гандлю, новых недахопаў і цэн касецца. Пабач з гэтым высьвятлены пастановы 14-га зьезду Усе КП па гаспадарчаму будаўніцтву.

Аб недахопах. Шкада, што аўтар дае кніжке у дастатковай меры выявіў экономічную пляцформу опозіцыйнага блёку і не паказаў, што безумоўна патрэбна было зрабіць гаворачы аб будаўніцтве соцыялізму.

Аб прыкладах сучаснага дню такжа мала гаворыцца. Абмінуты такія важныя пытаньні, як за політыка зарплаты, ролі спэцыялістых і г. д.

Але калі ня лічыць гэтых недахопаў кніжка А. Падгорнага, без мала праці карысьці кожнаму чытачу і ўвядзе яго ў курс нашага гаспадарчага жыцьця.

Я. Зэльцар.

Суд над „Чырвоной Зьменай“

Суд над «Чырвонай Зьменай», які прызначаўся на серада 12 студзеня адбудзецца сёньня 14 студзеня у памяшканьні Дому Працасьветы.

Пачатак а 8 гадзіне увечары.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІК, Д. КУРПІК

Галоўліт 23059 2 ая Дзярждрукарня БДВ.